Л.М. Манакова,
начальнік аддзела міжнароднай і сацыякультурнай дзейнасці
ДУА «Інстытут культуры Беларусі»

А.М. Жукава,
загадчык сектара міжнароднай дзейнасці ДУА «Інстытут культуры Беларусі»

А.А. Агабалаева,
метадыст сектара міжнароднай дзейнасці ДУА «Інстытут культуры Беларусі»

# Перспектывы развіцця міжнароднага супрацоўніцтва ў дадатковай адукацыі дарослых

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Міжнароднае супрацоўніцтва з'яўляецца важным інструментам забеспячэння якасці ДАД, яе функцыянавання ў рэжыме інавацыйнага развіцця і разнастайных сеткавых сувязей.

ДАД сёння — гэта, у першую чаргу, сегмент рынку адукацыйных паслуг, які заклікаыны задавальняць сацыяльна-культурныя і эканамічныя запатрабаванні грамадства. На функцыянаванне і развіццё ДАД уздзейнічаюць сацыякультурныя, дэмаграфічныя, эканамічныя і іншыя фактары. Тэмп перамен вельмі імклівы, і чалавек успрымае свет як няўстойлівы і непрадказальны. Рост патрэбнасцей дарослага ў навучанні на ўсіх этапах жыццёвага шляху тлумачыцца неабходнасцю прыняць існуючую рэчаіснасць і знайсці сваё месца ў хутказменлівым свеце [2].

У XXI ст. чалавецтва выступіла з ідэяй бесперапыннай адукацыі, якая пачала рэалізоўвацца адразу ў некалькіх краінах. Прыярытэт у распрацоўцы яе канцэпцыі, асабліва ў прафесійнай адукацыі дарослых, належыць *Вялікабрытаніі*. У мэтах павышэння прафесійнага майстэрства там уведзены нацыянальны стандарт [6, с. 38—39].

У Законе аб арганізацыі бесперапыннай прафесійнай адукацыі ў сістэме бесперапыннай адукацыі, прынятым у *Францыі*, зафіксавана, што прафесійная бесперапынная адукацыя з'яўляецца нацыянальным абавязкам. На заканадаўчым узроўні створана сістэма інстытутаў для развіцця прафесійнай бесперапыннай адукацыі [6, с. 36].

У шэрагу краін *ЕС* і *Паўднёва-Усходняй Еўропы* стратэгія развіцця ДАД знаходзіцца ў працэсе распрацоўкі. У сувязі з гэтым прадстаўляе інтарэс вопыт арганізацыі дадатковай адукацыі на сучасным этапе ў Расіі, Украіне, еўрапейскіх краінах, у тым ліку Італіі, Швейцарыі, Германіі, Вялікабрытаніі, дзе ДАД уключаецца ў нацыянальныя стратэгіі і дзяржаўныя праграмы.

Адзначым, што асноўныя прынцыпы функцыянальнай дзейнасці ДАД у сферы культуры ў вышэйназваных краінах грунтуюцца на прыярытэтнасці дадатковай адукацыі; навуковасці ў змесце адукацыйнага працэсу; нацыянальнай накіраванасці;

даступнасці і прадастаўленні магчымасці кожнаму спецыялісту выкарыстоўваць усе формы дадатковай адукацыі; бесперапыннасці і забеспячэнні сістэмнага працэсу адукацыі; дыферэнцыяцыі і індывідуалізацыі адукацыйнага працэсу з правам выбару розных форм ДАД у залежнасці ад адукацыйнага ўзроўню і вопыту работы слухача.

Сістэма ДАД у сферы культуры *Вялікабрытаніі* мае ўсталяваную тэарэтычную аснову і механізмы пастаяннага ўдасканалення. Важным паняццем для ўсёй брытанскай адукацыйнай сістэмы з'яўляецца курыкулум, які трактуецца андрагогамі па-рознаму: як курс навучання; вучэбная праграма; змест; саманакіраванае навучанне. Усё больш папулярным становіцца курыкулум як прадмет дамовы паміж выкладчыкам і навучэнцам. У гэтым кантэксце ён трактуецца як узаемадзеянне выкладчыка і навучэнца і адказвае прынцыпам асобаснай актуальнасці, індывідуалізацыі і практычнай арыентаванасці.

На сённяшні дзень у брытанскай сістэме ДАД актыўна развіваюцца інавацыйныя тэхналогіі і метады навучання, якія дазваляюць эфектыўна асвойваць матэрыял. Так, у практыцы выкарыстоўваюцца тры асноўныя мадэлі навучання: традыцыйна-дыдактычная, праблемна-пошукавая і фасілітыруючая. У апошняй мадэлі навучання дзейнасць выкладчыка зводзіцца да ролі фасілітатара або гіда-кансультанта, а не кіраўніка адукацыйнага працэсу. Важнае адрозненне фасілітыруючай мадэлі навучання ад традыцыйна-дыдактычнай і праблемна-пошукавай у тым, што яна з'яўляецца засяроджанай на навучэнцы.

*Італьянская сістэма* ДАД уключае двухгадовы курс павышэння кваліфікацыі (BIENNALE FORMATIVO DOCENTI / Biennio di Formazione docenti — BiForDoc). Курс BiForDoc прадугледжвае навучанне з адрывам ад вытворчасці альбо без адрыву ад вытворчасці. Сярод умоў навучання — распрацоўка індывідуальных праектаў па спецыяльных прадметах.

Асобны напрамак ДАД у сферы культуры ўяўляюць летнія курсы (школы). Гэтая сістэма ў Італіі найбольш адладжаная, мае шматгадовую практыку. Таксама атрымалі распаўсюджанне курсы павышэння кваліфікацыі on-line, якія ўключаюць on-line лекцыі, тэсты, дыскусіі, індывідуальную працу з выкладчыкам. У цэлым ДАД у асноўным арыентавана на практычныя формы працы — ролевыя гульні, рэфлексіўнае навучанне, трэнінгі, актыўную практыку.

Сістэма работы з дарослымі ў сферы культуры ў *Швейцарыі* характарызуецца шырокім спектрам паслуг і прапануе як розныя праграмы ў сферы павышэння кваліфікацыі прафесіяналаў з наступным атрыманнем сертыфіката аб заканчэнні курса, так і мерапрыемствы, якія адкрыты для ўсіх зацікаўленых асоб (сімпозіумы, калёквіумы, workshop, майстар-класы, лекцыі і г.д.).

Заканадаўствам Швейцарыі прадугледжана правядзенне на базе Hochschule і кансерваторый штогадовых зімовых школ для спецыялістаў сферы культуры і шырокага кола зацікаўленых. На базе кансерваторый праводзяцца кароткатэрміновыя курсы для дарослых навучэнцаў, прафесіяналаў або аўтарскія курсы для аматараў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У *Германіі* сістэма ДАД развіта living рознабакова і мае гістарычную дыстанцыю, якая дазваляе выявіць пазітыўныя бакі і прадуктыўныя напрамкі работы ў галіне. Так, у рамках праграм DAAD (Нямецкай Акадэмічнай службы Абменаў) існуе мноства праграм дадатковай адукацыі ў фарматах азнаямленчых семінараў, практычных заняткаў, курсаў лекцый. Прыярытэт у змястоўным напаўненні ДАД у сферы культуры ў Швейцарыі і Германіі — праграмы, звязаныя з вывучэннем аўтэнтычных стыляў (адраджэнне, барока, класіцызм).

Змест дадатковай адукацыі ў *Расіі* рэалізуецца на аснове комплексу педагагічных тэхналогій, адаптаваных да кожнай узроставай групы, і грунтуецца на прынцыпах: адкрытасці, «рухомасці» сістэмы; цэласнасці (скіраванасць на дзеянне трыяды «аб’ект — суб’ект — вынік» навучання; дыялагічнасці (пошук адэкватных тэхналогій, методык і практык інтэрактыўнага навучання); уліку рэгіянальнага менталітэту навучэнцаў; апоры на традыцыі і наватарства; адаптыўнасці (сусветныя і айчынныя тэндэнцыі развіцця); пераемнасці (узаемадзеянне ўсіх элементаў адукацыйнай сістэмы, а таксама зместу і форм практычнай рэалізацыі праграм ДАД).

У ліку асноўных праблем і кірункаў развіцця ДАД расійскімі андрагогамі разглядаецца сацыяльнае партнёрства ў адукацыі дарослых; навучанне розных катэгорый дарослага насельніцтва; дадатковая адукацыя інвалідаў; сучасныя адукацыйныя тэхналогіі ў навучанні дарослых; пашырэнне ўдзелу дарослых ва ўпраўленні адукацыяй; падрыхтоўка андрагогаў і спецыялістаў, якія працуюць у міжсектаральнай прасторы.

Найважнейшым этапам у сучаснай сістэме ДАД Украіны з’яўляецца выбудоўванне платформы і актыўнае развіццё рынку дадатковых адукацыйных паслуг; разуменне неабходнасці вывучэння замежнага вопыту; імкненне айчыннай адукацыі стаць камплементарнай часткай адзінай сусветнай адукацыйнай прасторы [3].

Міжнародная дзейнасць устаноў дадатковай адукацыі Беларусі ажыццяўляецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі главы 12 Кодэкса і п. 9 Палажэння аб установе дадатковай адукацыі дарослых, заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь, дзяржаўнымі, галіновымі і рэгіянальнымі праграмнымі дакументамі [3].

Сёння дзяржаўныя ўстановы адукацыі Рэспублікі Беларусь і іншых дзяржаў актыўна пашыраюць такую форму міжнароднага супрацоўніцтва, як удзел у міжнародных праектах розных тыпаў. Яны прадугледжваюць: правядзенне сумесных навуковых даследаванняў, навукова-практычных семінараў, канферэнцый, круглых сталоў; акадэмічную мабільнасць; арганізацыю адукацыйных праграм (павышэння кваліфікацыі, навучальных курсаў і інш.); распрацоўку сумесных адукацыйных праектаў і праграм і інш.

*Міжнародныя праекты*, як правіла, маюць практычны характар. Яны накіраваны на стварэнне якасных выніковых прадуктаў, рашэнне актуальных праблем. Важнымі характарыстыкамі міжнароднага праекта з’яўляюцца: дынамічнасць (здольнасць мяняцца пад уздзеяннем знешніх умоў і абставін); цэласнасць (функцыянаванне праекта як адзінай сістэмы, у якой добра скаардынаваны ўсе сумес-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ныя дзеянні па дасягненню агульных мэт); перспектыўнасць (значнасць вынікаў праекта для развіцця сістэмы адукацыі); устойлівае развіццё (жыццяздольнасць вынікаў і эфектыўнасць далейшага развіцця). Міжнародныя праекты часта маюць інтэграцыйны альбо комплексны характар, што азначае ўключэнне ў адзін праект розных відаў дзейнасці: навукова-даследчай, адукацыйнай, інавацыйнай і інш.

Інбелкульт таксама мае шэраг іміджавых міжнародных праектаў.

З 1997 г. праводзіцца сумесны культурна-адукацыйны праект Рэспублікі Беларусь і Рэспублікі Польшча «Міжнародная летняя школа “Нясвіжская акадэмія”». Яго мэта — удасканаленне прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў з Беларусі, Літвы, Украіны, Малдовы і Эстоніі ў такіх галінах, як ландшафтна-паркавая архітэктура, ахова і рэстаўрацыя паркаў, сядзіб, помнікаў культуры. У праекце ўдзельнічаюць спецыялісты, якія імкнуцца да распрацоўкі стратэгіі адаптацыі культурнай спадчыны ў сваіх рэгіёнах у пэўным сацыякультурным асяроддзі.

З 2014 г. Інбелкульт запрашае прадстаўнікоў грамадскіх аб’яднанняў беларусаў замежжа на праграмы майстар-класаў, распрацаваныя ў адпаведнасці з Дзяржаўнай праграмай супрацоўніцтва з беларусамі замежжа «Беларусы ў свеце» на 2013—2015 гады, накіраванай на забеспячэнне комплекснага ўзаемадзеяння органаў дзяржаўнага кіравання, грамадскіх аб’яднанняў краіны з беларусамі замежжа, далучэнне беларускай дыяспары да ўдзелу ў рэалізацыі праграм сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця Рэспублікі Беларусь, захаванне і падтрымку нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці. Праблематыка, якой прысвечаны майстар-класы культурна-адукацыйных праграм «Майстэрства калектываў аматарскай творчасці і іх роля ў прэзентацыі беларускай культуры за мяжой» (2014), «Дзейнасць калектываў аматарскай творчасці па зберажэнню культурнай самабытнасці і іх роля ў прэзентацыі беларускай культуры за мяжой» (2015), — шырокая, разнастайная і практыкаарыентаваная, накіраваная не толькі на пашырэнне і атрыманне агульнага кругагляду кіраўнікоў аматарскіх калектываў, спецыяльных ведаў, але і на набыццё практычных навыкаў у розных галінах ведаў з мэтай іх укаранення ў шматпланавую дзейнасць па вывучэнню, захаванню і распаўсюджанню беларускай культуры за мяжой, як сярод беларускай дыяспары, так і прадстаўнікоў іншых культур свету [4, с. 5].

З мэтай наладжвання кантактаў з дыпламатычнымі місіямі і арганізацыямі замежных краін Інбелкультам распрацаваны праект «Міжнародны культурны дыялог». У яго межах з 2012 г. арганізаваны круглыя сталы з удзелам прадстаўнікоў дыпламатычных місій і арганізацый замежных краін: «Беларусь — Расія» (2013 г.); «Беларусь — Іран» (2013 г.); «Беларусь — Японія» (2013 г.); «Беларусь — Кітай» (2014 г.); «Беларусь — Ізраіль» (2015 г.). Адбыліся выставы і прэзентацыі твораў майстроў мастацтва замежных краін для слухачоў павышэння кваліфікацыі кадраў культуры: выстава карцін ізраільскіх мастакоў «Па слядах Марка Шагала», выстава партрэтаў вядомых грамадскіх дзеячаў, выхадцаў з Беларусі «Гонар нацыі», выстава ізраільскага мастака Ёсефа Бау «Халакост вачыма вязня», выстава





РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кітайскага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, кніг ізраільскіх пісьменнікаў і інш.

На сённяшнім этапе ў міжнародным аспекце можна вылучыць два *перспектыўныя напрамкі* па ўсталяванню міжнародных кантактаў з замежнымі ўстановамі адукацыі і арганізацыямі культуры з мэтай стварэння і рэалізацыі разнастайных навуковых, адукацыйных праектаў і культурна-адукацыйных праграм:

актыўнае нарошчванне колькасці замежных партнёраў для развіцця міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы ДАД;

далейшае развіццё і пашырэнне форм міжнародных кантактаў — навуковыя і навукова-практычныя канферэнцыі, семінары, трэнінгі, сімпозіумы, выставы [5].

Важным трэндам сучаснай нацыянальнай адукацыі з'яўляецца інтэграцыя ў еўрапейскую і сусветную адукацыйную прастору. Таму вызначальнымі фактарамі развіцця адукацыі з'яўляюцца ўсталяванне міжнародных кантактаў, арганізацыя і развіццё рознабаковага супрацоўніцтва з замежнымі партнёрамі.

У сучасных умовах міжнародныя праекты, якія фінансуюцца поўнасцю альбо часткова міжнароднымі фондамі і арганізацыямі, з'яўляюцца найбольш эфектыўнай формай міжнароднага супрацоўніцтва. Удзел у міжнародным праекце дазваляе:

атрымаць установай адукацыі дадатковыя фінансавыя сродкі для вырашэння неабходных задач (мадэрнізаваць адукацыйныя праграмы, тэхнічную базу, павысіць кваліфікацыю выкладчыкаў, якасць навучання і інш.);

пазнаёміцца з замежным вопытам, што з'яўляецца вельмі важным момантам ва ўмовах інтэрнацыяналізацыі адукацыі і далучэння Беларусі да Балонскага працэсу і ЕПВА;

стварыць умовы для прафесійнага росту выкладчыкаў, рэалізацыі іх навуковага, педагагічнага і творчага патэнцыялу.

Інбелкульт з улікам сучасных тэндэнцый развіцця адукацыі ставіць перад сабой задачы пашырэння міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне ДАД. Акрамя выкарыстання сучасных трэндаў пры стварэнні канцэпцыі развіцця міжнароднай дзейнасці, Інбелкульт праводзіць абагульненне і аналіз міжнародных праектаў для слухачоў навучальных курсаў.

Сярод найбольш перспектыўных у праграме міжнародных праектаў вывучаем наступныя:

па-першае, гэта праект ЕС «MOST». Ён накіраваны на пашырэнне кантактаў паміж грамадзянамі Беларусі і ЕС з мэтай абмену перадавым вопытам і паляпшэння ўзаемаразумення. Праграма дае магчымасць наведаць установы адукацыі краін ЕС, каб устанавіць і паглыбіць прафесійныя кантакты для далейшага супрацоўніцтва;

па-другое, з 2014 па 2020 г. дзейнічае праграма ЕС «Erasmus +». Беларусь удзельнічае ў гэтай праграме ў якасці краіны ўсходняга партнёрства разам з Арменіяй, Азербайджанам, Грузіяй, Малдовай і Украінай. Адным з ключавых

РЭПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кірункаў праграмы з'яўляецца супрацоўніцтва па распаўсюджванню інавацый і абмену вопытам. Дадзены кірунак падтрымлівае:

стратэгічнае партнёрства ў сферы адукацыі. У яго рамках прадугледжваецца дзейнасць, накіраваная на павышэнне прафесійнай кампетэнтнасці спецыялістаў праз іх далейшую адукацыю, удзел у адукацыйнай праграме павышэння кваліфікацыі;

навуковыя аб'яднанні; гэта міжнародныя, структураваныя і арыентаваныя на вынік праекты, якія ажыццяўляюцца ў супрацоўніцтве, галоўным чынам, паміж установамі адукацыі і прадпрыемствамі;

нарошчванне патэнцыялу ў сферы адукацыі; гэты праект накіраваны ў першую чаргу на супрацоўніцтва паміж установамі адукацыі краін ЕС і краін-партнёраў [7].

У рамках абодвух праектаў прадугледжана мабільнасць навучэнцаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў. Падтрымліваюцца праекты, накіраваныя на павышэнне якасці адукацыі, распаўсюджванне інавацыйных метадаў і тэхналогій, інтэрнацыяналізацыю сістэмы вышэйшай адукацыі, міжкультурнае ўзаемаразуменне, узаемаўзбагачэнне і супрацоўніцтва.

Свае праекты ў сферы адукацыі і культуры прапануюць іншыя міжнародныя арганізацыі. Так, Міжнародны фонд культурнай разнастайнасці ЮНЕСКА штогод праводзіць конкурс праектных заявак. Фонд падтрымлівае праекты, якія вядуць да структурных змен:

укараненне або распрацоўка стратэгій, мэта якіх — распаўсюджванне і доступ да разнастайных форм культурнага самавыяўлення, уключаючы прадукты, паслугі і мерапрыемствы ў сферы культуры;

умацаванне адпаведнай інстытуцыйнай інфраструктуры, у тым ліку прафесійнага патэнцыялу і арганізацыйных структур, неабходных для падтрымання мясцовых і рэгіянальных культур і рынкаў [8].

У сферах адукацыі, культурнага супрацоўніцтва і навуковых даследаванняў прапануюць свае праекты Вышаградскі фонд, Robert BoschStiftung, DAAD і іншыя арганізацыі.

Вышэйпазначаныя напрамкі дазваляюць пашырыць магчымасці ўстановы ДАД у сферы культуры праз развіццё і ўкараненне крэатыўнасці і інавацый як ва ўстановах ДАД, так і ва ўстановах культуры праз засваенне спецыялістамі адпаведных праграм.

Міжнароднае супрацоўніцтва з'яўляецца важным кампанентам у сістэме ДАД. Ажыццяўленне розных яго форм стварае ўмовы для:

рашэння прыкладных праблем адукацыі дарослых;

вывучэння перадавога прафесійнага і педагагічнага вопыту на аснове міжнароднай практыкі яго ўкаранення ў адукацыю дарослых;

удасканалення адукацыйнага працэсу;

распрацоўкі адаптаваных аўтарскіх методык на аснове замежнага вопыту, арганізацыі сумесных праектаў і праграм.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. *Герасименюк, А.* Дополнительное образование взрослых [Электронный ресурс] / А. Герасименюк. — Режим доступа : http://spok.by/izdaniya/ya-spok/dopolnitelnoe-obrazovanie-vzroslykh_0000000. — Дата доступа : 07.06.2016.
2. *Жолован, С.В.* Проактивное управление в системе дополнительного профессионального образования в конкурентной среде / С.В. Жолован // Человек и образование. — 2014. — № 4.
3. Изучить потребности кадров культуры в повышении квалификации и переподготовке и разработать научно-практические рекомендации по совершенствованию системы дополнительного образования взрослых : науч.-исслед. работа / ГУО «Институт культуры Беларуси». — Гос. реестр НИОКР(Т)Р. — № регистрации: 20132641. — Дата регистрации: 24.12.2013. — С. 698—729.
4. *Лапцёнак, І.Б.* Беларускія грамадскія аб'яднанні — важнейшы рэсурс папулярызацыі нацыянальнай культуры і захавання нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці / І.Б. Лапцёнак // Майстар-класы для кіраўнікоў творчых калектываў грамадскіх аб'яднанняў беларусаў замежжа : дзейнасць калектываў аматарскай творчасці па зберажэнню культурнай самабытнасці і іх роля ў прэзентацыі беларускай культуры за мяжой (Мінск, 14—18 снежня 2015 г.) : інфарм.-аналіт. матэрыялы. — Мінск : ДУА «Інстытут культуры Беларусі», 2015. — 15 с. — С. 5.
5. Международные отношения : виды, формы, принципы [Электронный ресурс]. — Режим доступа : http://cinref.ru/razdel/03900politolog/06/222662.htm. — Дата доступа : 20.01.2016.
6. *Юнацкевич, Р.И.* Теория образования взрослых : становление, проблемы, задачи : монография / Р.И. Юнацкевич. — СПб. : ИОВ ПАНИ, 2009. — 90 с.
7. Erasmus + : Programmleitfaden [Electronic resource]. — Version 2, 2016. — http://ec.europa.eu/programmes/erasmus-plus/documents/erasmus-plus-programme-guide_de.pdf. — Date of access: 16.03.2016.
8. Basic Requirements for Eligible Funding Requests [Electronic resource]. — http://en.unesco.org/creativity/ifcd/apply/basic-requirements-eligible-funding-requests. — Date of access: 16.03.2016.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ